# Трымаць узровень

Больш за 100 гадоў сацыяльна-гуманітарны каледж МДУ імя А.А.Куляшова рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў — будучых выхавальнікаў дашкольнай адукацыі.

Якія метады і формы навучання выкарыстоўваюць яго педагогі, даведаліся ў намесніка дырэктара па вучэбнай рабоце Ірыны Уладзіміраўны Яўменчык.

— Навучанне ў нашым каледжы мае практыка-арыентаваны характар. Педагогі праводзяць практыкумы, мазгавы штурм, дзелавыя гульні, круглыя сталы, майстар-класы, семінары, конкурсы па распрацоўцы бізнес-праектаў, сустрэчы з прадстаўнікамі арганізацый — заказчыкаў кадраў, алімпіяды, віктарыны, выставы. Пачынаючы з другога курса навучэнцы ўдасканальваюць свае веды, уменні і навыкі на базах вядучых устаноў дашкольнай адукацыі Магілёва. Наша ўстанова не раз станавілася базавай пляцоўкай для правядзення абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства WorldSkills па кампетэнцыі "Дашкольная адукацыя". У ім жа нашы вучні перамагаюць на абласных і рэспубліканскіх этапах. Каледж ажыццяўляе міжнароднае супрацоўніцтва з установамі адукацыі Расійскай Федэрацыі, арганізоўвае для ўдзельнікаў стажыроўкі, майстар-класы, вэбінары і круглыя сталы.

Ірына Уладзіміраўна падкрэсліла, што, нягледзячы на тое, што каледж некалькі разоў за сваю векавую гісторыю мяняў назву, высокі ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў і накіраванасць на дасягненне лепшых вынікаў застаюцца нязменнымі.

**Матэрыялы Соф'і ЦЫКУНОВАЙ.**

